*В. М. САКАЛОВА, А. І. СМОЛІК*

# ЭКСКУРСІЯ ЯК СРОДАК ІНКУЛЬТУРАЦЫІ СТУДЭНТАЎ

*На прыкладзе дзейнасці кафедры культуралогіі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў разглядаецца працэс засваення студэнтамі культурных каштоўнасцей, далучэння да нацыянальнай культуры і гісторыі. Абгрунтоўваецца актуальнасць выкарыстання вучэбнай экскурсіі як важнага складніка інкультурацыі моладзі, сродку прафесійнага станаўлення студэнтаў, якія вучацца па спецыяльнасці «тэорыя і гісторыя культуры».*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Якасна новы ўзровень развіцця грамадства абумоўлівае сёння змяненне матываў дзейнасці асобы. Пачынаюць дамінаваць фактары ўнутранага развіцця чалавека, арыентаванага на дасягненне ўзроўню самаактуалізацыі, нарошчванне інтэлектуальнага і творчага патэнцыялу [3, с. 3]. Духоўныя фактары дзейнасці выяўляюцца як патрэбнасці, якія змяняюць матэрыяльныя запыты. Адбываецца «смещение эпицентра всего человеческого бытия – к полюсу культуры» [1]. Сфера дзейнасці напаўняецца духоўным зместам, і кожны індывід займае ў ёй сваю жыццёвую прастору.

Дзейнасць асобы пачынаецца з паступовага ўваходжання ў соцыум шляхам засваення неабходнай колькасці ведаў, традыцый і норм паводзін, якія дазваляюць індывіду існаваць у якасці паўнавартаснага члена грамадства. Гэты працэс засваення ідывідам норм грамадскага жыцця і культуры пазначаецца ў гуманітарных навуках паняццем *інкультурацыя*.

Працэс інкультурацыі ажыццяўляецца на працягу ўсяго жыцця, але ў фарміраванні асобы вылучаюцца найбольш плённыя перыяды, калі яна мэтанакіравана, сістэматычна і арганізавана ўключаецца ў сацыякультурную практыку. Такім перыядам, напрыклад, з’яўляецца навучанне ў ВНУ, калі падчас вывучэння цыкла сацыягуманітарных дысцыплін студэнт засвойвае кагнітыўныя аспекты культуры – веды, вераванні, каштоўнасці, традыцыі, навацыі. Працэс засваення ведаў у вышэйшай школе будуецца з улікам і пазааўдыторных форм вучэбна-пазнавальнай дзейнасці, напрыклад экскурсій у асяроддзе народнай і элітарнай культуры краіны, з мэтамі назірання і аналізу пэўных з’яў, феноменаў і культурных працэсаў. Неабходна, каб студэнты, асабліва гэта датычыцца студэнтаў мастацка-творчых ВНУ, не толькі засвойвалі тэорыю культуры, мастацтва, але і самі непасрэдна далучаліся да прыгожага, перажывалі захапленне ад сустрэчы з творамі выяўленчага мастацтва, архітэктуры, музыкі.

Ж.-Ж. Русо ў працы «Об общественном договоре» (1762) выказваў думку, што выхаванне эстэтычных і маральных якасцей у навучэнцаў павінна адбывацца ў працэсе іх знаёмства з гісторыяй, культурай, біяграфіямі знакамітых людзей. Індывіда, паводле Русо, неабходна навучыць самастойна даследаваць прадметы і з’явы, што яго акружаюць [4]. Мысліцель звяртаўся да пакалення XVIII ст., якое яшчэ не адчула негатыўнага ўздзеяння масавай культуры, не было знаёма з тэхнагеннымі відамі мастацтва і мела магчымасць назіраць творчы працэс непасрэдна, у фармаце «тут і цяпер». Радыё, кіно, тэлебачанне, камп’ютар аддалілі рэцыпіента ад

творцы. Эстэтычнае ўспрыманне ў суб'ектаў культуры XXI ст. фарміруецца «возле экрана и звуковой мембраны» [2, с. 457]. Сучаснае пакаленне страціла чароўнасць непасрэдных стасункаў з артэфактамі культуры ў музеі, тэатры, на выстаўцы, вернісажы. Таму педагогіка, у тым ліку і педагогіка вышэйшай школы, шукаюць шляхі далучэння моладзі да культурных аб'ектаў.

Эфектыўным сродкам непасрэдных плённых зносін з творамі мастацтва, на наш погляд, з'яўляюцца вучэбныя экскурсіі, якія ў педагогіцы лічацца знешнім фактарам засваення культурных каштоўнасцей. Зыходзячы з гэтага для студэнтаў спецыяльнасці «тэорыя і гісторыя культуры» выкладчыкамі кафедры культуралогіі ў межах азнаямляльнай, педагагічнай і вытворчай практыкі прадугледжваюцца экскурсіі ў культурную прастору беларускіх гарадоў. Як правіла, гэта комплексныя экскурсіі, калі паглыбляюцца веды не па адной канкрэтнай, а некалькіх шырокіх тэмах, якія ахопліваюць матэрыял розных дысцыплін (культуралогіі, тэорыі і гісторыі мастацтва, літаратуры, гісторыі Беларусі, этнаграфіі). Мэты такой работы не толькі пашырэнне ведаў, але і актывізацыя творчай і навуковай дзейнасці студэнтаў, набыццё практычных навыкаў правядзення экскурсій, распрацоўка маршрутаў. Так, за апошнія тры гады студэнты і магістранты разам з педагогамі ўніверсітэта наведалі Мірскі і Нясвіжскі палацава-замкавыя комплексы, Лідскі замак, горад-музей Гродна.



У 2012 г. на І Нацыянальным форуме «Музеі Беларусі» Гомельскі палацава-паркавы ансамбль атрымаў Гран-пры як лепшы музей краіны, менавіта таму кафедрай культуралогіі была арганізавана экскурсія ў Гомель, каб студэнты сваімі вачыма пабачылі мастацтва архітэктуры і скарбніцу збораў жывапісу, дойлідства,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

старажытнай кнігі, манет і іншых артэфактаў культуры – Палац Румянцавых і Паскевічаў, старадаўні парк – помнік садова-паркавага мастацтва сярэдзіны XIX ст., зацікавіліся жыццём выдатных гістарычных асоб – дзяржаўных і грамадскіх дзеячаў, мецэнатаў, якія садзейнічалі росквіту Гомеля і з’яўляюцца прыкладам сапраўднага патрыятызму.



Набыццё шырокай гуманітарнай культуры, станаўленне чалавека выхаванага, засваенне сістэмы каштоўнасных арыентацый адбываецца пры дапамозе азнаямлення з дзейнасцю дастойных гістарычных асоб. Так, не можа не захапіць лёс графіні Ірыны Паскевіч (народжанайВаранцовай-Дашкавай) – апошняй гаспадыні Гомельскага маёнтка, якая ўпершыню пераклала на французскую мову «Вайну і мір» (яе пераклад высока ацэньваў Л. М. Талстой), займалася дабрачыннай дзейнасцю: заснавала прытулкі, вучылішчы ў вёсках, бальніцы, радзільны дом, вочную лячэбніцу, штогод у гімназіях горада на яе грошы навучалася больш за два дзясяткі дзяцей з малазабяспечаных сямей. Такі шлях далучэння моладзі да найлепшых прыкладаў духоўнасці здаецца эфектыўным падчас фарміравання ўнутранай культуры асобы.

Прыведзеныя намі экскурсіі ўяўлялі сабой не звычайныя азнаямляльныя паездкі па цікавых мясцінах. У кожнай праводзіліся трэнінгі пешаходных і аўтобусных экскурсій, майстар-класы выкладчыкаў – вядучых спецыялістаў кафедры – П. Р. Ігнатовіча і А. І. Смоліка.

Як вядома, фактарам паспяховай падрыхтоўкі спецыялістаў з’яўляецца аптымальнае спалучэнне тэорыі і практыкі, таму зразумела зарыентаванасць дзейнасці студэнтаў на самастойнае правядзенне цікавых і змястоўных экскурсій. Напярэдадні экскурсій яны атрымоўваюць ад выкладчыка даручэнні распрацаваць рэфераты аб культурных аб’ектах, праз якія пралягае маршрут экскурсіі. Вядома, на шляху да намечанага для наведвання аб’екта заўсёды сустракаецца шмат культурна-гістарычных мясцін. Таму за тры-чатыры гадзіны знаходжання ў дарозе ёсць магчымасць агучыць каля 8 рэфератаў. Студэнты рыхтуюць паведамленні пра гарады і вёскі, адкуль яны родам, вучацца публічнаму маўленню, слухаць і ўмець адказваць на пытанні, набываюць навыкі рыторыкі. Але і кожны жадаючы можа ўзяць у рукі мікрафон і расказаць пра свой горад ці вёску, жыхароў, вядомых людзей. Напрыклад, у Гомелі з горадам знаёміла студэнтка-гамельчанка.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ



Экскурсіі спрыяюць згуртаванасці калектыву кафедры, студэнтаў і выкладчыкаў, узаемадзеянням і шчыльным творчым зносінам студэнтаў розных курсаў, перадачы вопыту ад старэйшых малодшым. Так, магістранты дзяліліся вопытам работы ў Нацыянальным мастацкім музеі, раённых культурных цэнтрах, першымі крокамі ў прафесіі. Адбываецца калектыўнае ўзаемаўзбагачэнне, яно дае магчымасць студэнтам паглыбіць веды, набыць практычныя навыкі, а настаўнікам – праявіць выкладчыцкія здольнасці.

Вельмі важна падрыхтаваць студэнтаў да ўспрымання эстэтычных каштоўнасцей. Куратары перад экскурсіяй фармулююць рэкамендацыі, якіх неабходна прытрымлівацца падчас «спаткання» з артэфактамі мастацтва. Напярэдадні экскурсіі студэнты атрымліваюць таксама заданні самастойна азнаёміцца з інфармацыяй аб гісторыі мясцін, дзе будзе адбывацца экскурсія, вызначыць кожнаму свой артэфакт, па якім неабходна будзе зрабіць культуралагічны аналіз. Такім чынам, экскурсіі папярэднічае псіхолага-педагагічная, эмацыянальная і эстэтычная настройка на ўспрыманне мастацкіх твораў.

Звычайна ў якасці аналізуемага артэфакта выступае твор выяўленчага мастацтва, архітэктуры, скульптура, помнік кніжнай ці музычнай культуры, касцюм. Наведванне палацава-паркавых комплексаў з іх музеямі, галерэямі, выстаўкамі, храмамі, кніжнымі зборамі і архівамі дазваляе найбольш поўна прадставіць і захаваць у памяці феномены мастацкай культуры, адчуць патаемную радасць ад пачуцця, што гэта найпрыгажэйшая спадчына пакінута нашым нашчадкам.

Ажыццяўленне культуралагічнага аналізу артэфакта мастацкай культуры – з'ява складаная, якая патрабуе грунтоўных ведаў у галінах культуралогіі, мастацтвазнаўства, гісторыі, літаратуры, этналогіі і інш. Падчас падрыхтоўкі да экскурсіі і ў яе працэсе ўвага студэнтаў звяртаецца на неаб-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ходнасць успрымання артэфактаў культуры з улікам гісторыка-культурнай сітуацыі, якая паўплывала на адметнасці помніка культуры. Аналіз уключае таксама вызначэнне стылявых асаблівасцей, жанру, роду, пэўнага віду мастацтва, як суадносяцца выразныя сродкі і прыёмы стварэння пэўнага твора. Безумоўна, заданні для аналізу артэфактаў мастацкай культуры даюцца з улікам тэарэтычнай і практычнай падрыхтаванасці студэнтаў, іх уласнага вопыту. Аналітычныя заданні першакурснікаў і выпускнікоў, а тым больш магістрантаў, істотна адрозніваюцца.

Акрамя мастацтвазнаўчага аналізу прадугледжваецца разгляд твора як пэўнага тэксту культуры, складанага полікультурнага ўтварэння. Таму студэнтам старшых курсаў і магістрантам даручаецца ў працэсе экскурсіі вызначыць у пэўным артэфакце знакавыя, сімвалічныя, тэкстуальныя, кантэкстуальныя і культурна-камунікатыўныя характарыстыкі. Так, артэфакт культуры ў мастацкім кантэксце з’яўляецца складанай інтэграванай сістэмай гетэрагенных знакаў: іканічных (праяўляюцца ў форме і яго элементах); знакаў, якія фарміруюцца ў кантэксце мастацкага матэрыялу твора і арсенале яго выразных сродкаў; мастацкіх сімвалаў у якасці сэнсавага, інтэгравальнага ядра вобраза. Кожны культурны тэкст (касцюм, карціна, скульптура, кніга, помнік архітэктуры, твор дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва) мае спецыфіку знакавага праяўлення і свой спосаб выкарыстання гэтай мовы. Мэтай экскурсіі і з’яўляецца навучыць студэнтаў выяўляць дадзеную спецыфіку.

Экскурсія не завяршаецца развітаннем па вяртанні да альма-матар. На семінарскіх занятках абмяркоўваюцца вынікі экскурсіі, адбываецца абмен уражаннямі, што часам перарастае ў дыскусіі, ладзяцца прэзентацыі і выстаўкі. Нярэдка нараджаюцца ідэі, якія распрацоўваюцца ў курсавых і дыпломных работах. Але галоўным здабыткам такіх экскурсій з’яўляецца выхаванне культуры ўспрымання артэфактаў мастацтва, выпрацоўка навыкаў і ўменняў культуралагічнага аналізу помніка культуры.

Такім чынам, у працэсе экскурсіі, актыўнага ўключэння студэнтаў у культурнае асяроддзе фарміруюцца матывацыйныя ўстаноўкі асобы на засваенне нацыянальнай культуры, дасягаецца мэта інкультурацыі – выхаванне асобы, кампетэнтнай у культуры.

---


1. *Библер, В. С.* От наукоучения – к логике культуры : два философских введения в XXI век [Электронный ресурс] / В. С. Библер. – М. : Политиздат, 1991. – 413 с. – Режим доступа: http://philosophy.ru/library/bibl/bibler.html. – Дата доступа: 11.02.2013.

2. *Грачева, О. О.* Формирование культуры восприятия искусства как проблема артпедагогики / О. О. Грачева // Культура. Наука. Творчество : VI Междунар. науч.-практ. конф., Минск, 10–11 мая 2012 г. : сб. науч. ст. / Мин-во культуры Респ. Беларусь, Белорус. гос. ун-т культуры и искусств ; науч. ред. М. А. Можейко. – Минск : БГУКИ, 2012. – С. 455–459.

3. *Милинчук, Е. С.* Институциональная структура рынка нематериальных услуг в постиндустриальной экономике / Е. С. Милинчук. – Саратов : Научная книга, 2006. – 36 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

4. *Руссо, Ж.-Ж.* Об общественном договоре, или Принципы политического права. Трактаты : пер. с фр. / Ж.-Ж. Руссо. – М. : КАНОН-пресс : Кучково поле, 1998. – 416 с.

*V. SAKALOVA, A. SMOLIK*

**EXCURSION AS A MEANS OF STUDENTS' ENCULTURATION**

*The process of assimilation of cultural values by students and initiation students to the national culture and history are analyzed in the article. The investigation is based on the examples of «The Department of Culture Studies» work. The author substantiates the actuality of such important component of youth enculturation as an educational excursion, which creates the professional background for the students of «Theory and History of Culture» speciality*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ